Найбольш вядомымі прадстаўнікамі трэцяй групы з'яўляюцца Д.Віка, Р.Арон, Марк-Івен, Пейдж.

Да асобнай групы можна аднесці У.Растоу, які грамадскі прагрэс выводзіў з тэхнічнага. У 70-я гады нашага стагоддзя Дж.Гэлбрэйт стварае тэорыю «новага індустрыяльнага грамадства», Г.Вікерс -- «постліберальнай эры», А.Норман - «інфармацыйнага грамадства», А.Гартнер -- «грамадства спажывання», Э.Бжэзінскі – тэорыю «тэхнатроннага грамадства».

Калі гаворка ідзе аб сацыяльных выніках навукова-тэхнічнага прагрэсу, дык нельга абысці ідэі, якія былі выказаны амерыканскім футуролагам О.Тофлерам. Ён напісаў кнігі «Футура-шок», «Трэцяя хваля», «Зрух улады. Веды, багацце і насілле на парозе XXI стагоддзя». Футуролаг лічыць, што грамадства прайшло такія этапы развіцця: аграрны, індустрыяльны і інфармацыйны. У апошняй рабоце Тофлер звяртае ўвагу не толькі на зрухі ўлады на глабальным узроўні, але і на зрухі ўлады на больш нізкіх узроўнях: на ўзроўні адукацыі, аховы здароўя, фінансаў, бізнесу, сродкаў інфармацыі. На змену ўлады грошай у індустрыяльным грамадстве прыходзіць улада тых, хто валодае навейшай інфармацыяй. Развіццё інфармацыйнага грамадства дапускае пераход да грошай, якія носяць сімвалічны характар, яны з'яўляюцца электроннымі імпульсамі. На парозе XXI стагоддзя адбываюцца зрухі ў бок ведаў як капіталу. Працэс камп'ютэрызацыі з'яўляецца не толькі новым фактарам грамадскага прагрэсу, але і садзейнічае паскарэнню эканамічных працэсаў. Да асаблівасцей сучаснай эпохі Тофлер адносіць і пераадольванне ідэі аб узаемазамяняльнасці працаўнікоў, якая сваім нараджэннем абавязана канвеернай вытворчасці. Цяпер да працаўнікоў прад'яўляюцца зусім іншыя патрабаванні: здольнасць да творчай працы, схільнасць да новага. Змены ў сучасным грамадстве вядуць да таго, што найбольш эфектыўным сродкам улады становяцца веды. Але веды ў грамадстве размяркоўваюцца яшчэ больш нераўнамерна, чым багацце і зброя. Вось чаму пераразмеркаванне ведаў, інтэлектуальных рэсурсаў з'яўляецца важнейшай задачай сучаснай цывілізацыі. За гэтым стаіць цяжка вырашаемая праблема навуковай і тэхнічнай адсталасці большасці краін.

В.С.Спёпін лічыць, што ў XX стагоддзі рэзервы цывілізацыйнага росту вычарпалі сябе, аб чым сведчаць многія глабальныя супярэчнасці. Цяпер узнікае новая культура ўзаемаадносін паміж чалавекам і грамадствам. Гісторыя грамадства пераўтвараецца не ў гісторыю асобных дзяржаў і народаў, а ў глабальную гісторыю, калі змены ў жыцці адных краін уплываюць на жыццё другіх. Асаблівасцю будучыні Спёпін лічыць пераход ад насілля да ненасілля.

Што датычыць нашай думкі аб будучыні, то далучаемся да тых, хто свой вопыт лічыць песімістычным, але не адмаўляе развіцця грамадства па ўзыходзячай лініі.

Лапіна С.В.,
докт.сацыял. навук

## КУЛЬТУРАЗНАЎСТВА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

Стварэнне дысцыплінарна арганізаванай навукі -- гэта яе класічная спадчына, якая не страціла сваёй актуальнасці і на сённяшні час. У адпаведнасці з узорамі класічнай навукі кожная дысцыпліна, у тым ліку і тая, што вывучала культуру, знаходзіла свой асаблівы ракурс у даследаваннях гэтага складанага і шматбаковага феномена. Тым самым антрапалогія, этнаграфія, агульная гісторыя, псіхалогія і іншыя навукі рабілі ўклад у змястоўнае ўвасабленне такой з'явы, як культура. Вынікі гэтых даследаванняў аб'яднаны ў культуразнаўстве.

Вядома, што культура можа вывучацца і як адзіны феномен, цалкам, у сістэмным увасабленні. Культура -- гэта сукупнасць асаблівых стасункаў стварэння і развіцця чалавечай жыццядзейнасці, якія ўвасабляюцца у матэрыяльных і духоўных каштоўнасцях. З мэтай адлюстравання сістэмнага адзінства культуры ўзнікла такая дысцыпліна, як тэорыя і гісторыя культуры. Але канцэптуальная аднабаковасць часцей за ўсё прыводзіла да стварэння розных, нават не сумяшчальных тэорый культуры. Для іх аб'яднання ўзнікла яшчэ адна культуразнаўчая дысцыпліна -- культуралогія. Яна па сутнасці павінна была існаваць у якасці метатэарэтычнай, пазатэарэтычнай дысцыпліны. Такім чынам, у культуразнаўстве ўзнікла даволі складаная канструкцыя з навуковых дысцыплін, дзе межы іх не заўсёды дакладна акрэсліваюцца.

Становішча не было б такім складаным, калі б культуразнаўства наблізілася да ідэалаў і нормаў сучаснай навукі. Для яе ж характэрна разбурэнне парканаў між дысцыплінамі і аб'яднанне іх ў адзіную сістэму, якой і ўяўляецца сучасная навука.

Сярод сістэмаўтваральных фактараў у адзінай сістэме навуковых ведаў на першы план выходзяць сацыялагічныя параметры, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць і на ўзроўні аб'ектаў даследавання сучаснай навукі, і на ўзроўні яе суб'ектаў.

Што тычыцца вывучэння культуры, то гэтыя сацыялагічныя пераменныя заўсёды ўлічваліся навукоўцамі розных школ і напрамкаў, хаця і не заўсёды аднолькава трактаваліся. Розныя стасункі ўвасаблення чалавечай жыццядзейнасці знаходзяць адлюстраванне не толькі ў прадметных, але і ў суб'ектных каштоўнасцях. І тое, што культура -- гэта вынік развіцця асабістай чалавечай прыроды, так званая «другая прырода», якая створана, увасобілася і рэалізуецца ў дзейнасці розных суб'ектаў (сацыяльных груп, супольнасцей і індывідаў як іх членаў), не выклікае сумненняў у большасці даследчыкаў культуразнаўства.

Сярод навук, якія зрабілі прадметам свайго аналізу суб'ектныя асаблівасці грамадскіх зносін, вылучаецца сацыялогія -- навука аб розных стасунках утварэння, развіцця і ўвасаблення суб'ектаў гістарычнага вызначэння грамадскіх зносін.

Уключэнне сацыялагічных параметраў у сферу даследавання розных навуковых дысцыплін, што вывучаюць культуру, стварае ўмовы для іх не толькі фармальнага, але і змястоўнага аб'яднання ў адзіным на-вуковым і навучальным цыкле.

Сацыялагічны ж «паварот» тэорыі і гісторыі культуры дазваляе ствараць яе па ўзорах сучаснай навукі, у якой улічваюцца не толькі асаблівасці прадмета навуковага даследавання, але метадалагічныя і светаўспрымальныя высновы навукоўцаў, што ажыццяўляюць канкрэтныя даследаванні.

Такім чынам, культуразнаўства цалкам, і тэорыя культуры у тым ліку, у кантэксце сучаснай навукі ўяўляецца як цэльная сістэмная канструкцыя, у якой некаторае мноства тлумачальных мадэлей карэліруецца з мноствам мадэлей вывучаемай культурнай рэальнасці.

Такая некласічная трактоўка культуразнаўства не патрабуе вылучэння асобных пазатэарэтычных дысцыплін па тыпу культуралогіі. Затое такі падыход патрабуе засваення асноў сацыялагічных даследаванняў, якія дазваляюць атрымліваць неабходныя для культуразнаўства веды аб вывучэнні механізмаў чалавечай жыццядзейнасці ў розных грамадскіх суполках.

Гупаленка Л.А.,
докт.філас. навук

## СУБСТАНЦЫЯЛЬНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА ЯК ПРАЯВА ЯГО УНІВЕРСАЛЬНАСЦІ

Дэмакратызацыя і гуманізацыя нашага грамадства патрабуюць грунтоўнага вывучэння суб'екта, чалавека, яго прыроды, сутнасці. Тут шмат чаго трэба перагледзець і ўдакладніць.

Сукупнасць грамадскіх адносін -- вельмі значная ўмова для фарміравання якасцей і рыс чалавека як сацыяльнай істоты. Аднак яны не вычэрпваюць зместу і выніку гэтага працэсу. Тое, якім індывід існуе ў гісторыі наогул, як асоба ў грамадстве, індывідуальнасць, залежыць таксама ад матэрыяльнай вытворчасці, ўсіх сфер жыцця, відаў дзейнасці, духоўнай культуры, генетычнай спадчыны, прыродных схільнасцей і інш.

Такім чынам, маецца магчымасць больш дакладна высветліць сутнасць -- субстанцыю чалавека як родавай, універсальнай істоты, асобы і індывідуальнасці сацыяльнай супольнасці.

Хутчэй за ўсё ў гэтым статусе чалавек ўяўляе галоўныя:

1) біялагічныя і псіхалагічныя элементы:( прынцыпы функцыяніравання жывога арганізма, генетычны код, тэмперамент, прыродныя задаткі);

2) біясацыяльныя якасці, сфарміраваныя пад уплывам грамадска-вытворчай дзейнасці, іх атрымоўвае чалавек па лініі біясацыяльнага наследавання;

3) выключна сацыяльныя новаўтварэнні чалавечага індывіда: свядомасць, мараль, здольнасць да працы, творчасці, непаўторна унікальныя рысы, уменні, якія робяць чалавека здольным абагачаць культуру, яны набываюцца асабістымі намаганнямі індывіда на аснове таго, што далі яму прырода і грамадства. У гэтай сапраўднай універсальнасці з чалавекам не можа параўнацца ні адна з'ява, у тым ліку сацыяльная.

Паміж паняццямі «сутнасць», «субстанцыя», «субстрат» многа агульнага, але яны не супадаюць. Калі субстанцыя з'яўляецца ўсеагульнай асновай самаўзнікнення і самазмянення прадмета, дык субстрат служыць непасрэднай асновай і найбольш актыўнай прычынай гэтых працэсаў. Зыходзячы з пазіцыі дыялектычнага матэрыялізму, які прадугледжвае арганічную сувязь субстанцыі праз атрыбут з практыкай, маем рацыю сцвярджаць наступнае: дзякуючы сваёй свядомай дзейнасці, індывід з'яўляецца галоўным субстратам (субстанцыяй) сацыяльнай рэальнасці. Менавіта ён здольны быць сапраўдным суб'ектам культуры: свядома ствараць сацыяльны свет і пераўтвараць прыродны свет, а таксама формы, спосабы і прылады гэтай, па сваёй сутнасці, культурнай дзейнасці.

Сказанае дае падставу лічыць чалавека не толькі істотай са сваёй, уласнай сутнасцю субстанцыяй, але сутнасцю і субстанцыяй-субстратам сацыяльнай рэальнасці. Сапраўды, якая сацыяльная з'ява, акрамя чалавека, здольная прэтэндаваць на ролю субстанцыі грамадскай формы руху матэрыі, інакш кажучы, быць праяўленнем усеагульнай субстанцыі на вышэйшай ступені арганізацыі навакольнага свету? Маністычныя вучэнні сцвярджаюць, што гэтую ролю адыгрывае альбо матэрыя, альбо дух, дуалістычныя -- і тое, і другое, плюралістычныя -- што ўсе гэтыя пазіцыі маюць рацыю. Не паўтараючы ні адну з іх, мы выкажам свой пункт гледжання.

Менавіта чалавек як мікраўніверсум, мікракосм увасабляе тры галоўныя пачаткі: лепшыя вынікі эвалюцыі прыроды, гісторыі і свядомую дзейнасць людзей па светатварэнню і светапераўтварэнню. У асобе чалавека універсум развіўся да самай высокай формы ўсеагульнай субстанцыі -- матэрыі, калі ўпершыню з'ядналіся прырода, дух (сядомасць) і вышэйшая актыўнасць (мэтанкіраваная дзейнасць індывіда).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ